# Нямецкамоўны «Даведнік па гісторыі Беларусі»

Нямецкамоўны «Даведнік па гісторыі Беларусі»* — першае выданне такога тыпу. Кніга пабачыла свет увосень 2001 г. у германскім горадзе Гётынген (зямля Ніжняя Саксонія) і амаль што адразу стала бібліяграфічнай рэдкасцю. Яна ўяўляе сабой разгорнуты агляд сацыяльнай і культурнай гісторыі Беларусі ад часоў сярэднявечча да пачатку XXI ст.

Даведнік уключае 30 тэматычных артыкулаў, якія сабраны ў тры часткі.

Першая частка даведніка мае назву «Гістарыяграфія і геральдыка» (с. 25—66). У першым артыкуле германскі вучоны Р.Лінднер паказвае гісторыю Беларусі праз яе навуковае адлюстраванне ў гістарыяграфіі ў рамках інтэрпрэтацый расійскай і савецкай даследчых традыцый. Вынік, да якога прыходзілі прадстаўнікі згаданых навуковых школ, той, што тысячагадовай беларускай гісторыі проста не існавала па прычыне сваёй «правінцыяльнасці». Гэта значыць, адсутнічалі навуковыя працы аб гісторыі Беларусі ў заходнееўрапейскай гістарыяграфіі. Р.Ліндннер звяртае ўвагу на тое, што гісторыя Беларусі з самага пачатку была палітызавана. Адысці ад гэтага ўдаецца, як адзначае германскі даследчык, толькі са стварэннем нацыянальнай канцэпцыі гісторыі Беларусі.

У наступным матэрыяле даследчык з Венгры З.Семушын дае агляд гістарычных фактаў, звязаных са стварэннем дзяржаўнай сімволікі Беларусі. Разглядаючы гістарычны перыяд ад сярэднявечча і да сучаснасці, аўтар імкнецца правесці крытычны аналіз самых розных дакументальных крыніц і паказаць на канкрэтных фактах узнікненне сімволікі нашай краіны, яе дзяржаўнага герба і сцяга, а таксама новай дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь. У якасці наглядната пацвярджэння даследчык прыводзіць шэраг гістарычных малюнкаў.

Другая частка даведніка мае назву «Храналогія ад 10 да пачатку 21 стагоддзя» (с. 67—196).

Першыя два артыкулы ахопліваюць перыяд ад узнікнення Полацкага княства і да ўтварэння Рэчы Паспалітай. Іх аўтарам з'яўляецца беларускі гісторык П.Лойка. На аснове вялікай колькасці крыніц ён паказаў асноўныя працэсы дзяржаваўтварэння на беларускіх тэрыторыях.

Адлюстраванне важнейшых падзей XVI—XVIII стст. дадзена ў двух артыкулах Г.Сагановіча. У іх асвятляюцца гістарычныя падзеі на беларускіх землях пасля ўваходжання ВКЛ у Рэч Паспалітую і гістарычныя падзеі з сярэдзіны XVII ст. да апошняга падзелу «польска-літоўскай рэспублікі» ў 1795 г.

Лёс Паўночна-Заходняга краю ў складзе Расійскай імперыі ад часу ўключэння ў яе беларускіх тэрыторый і да 1917 г. разглядае З.Шыбека. Ён падрабязна спыняецца на пытаннях аб захаванні традыцый Рэчы Паспалітай на тэрыторыі Паўночна-Заходняга краю, аналізуе вынікі працэсу «дэпаланізацыі» ў другой чвэрці XIX ст., дае апісанне момантаў вызваленчай барацьбы ў краі ў пачатку 1860-х гг. Нямецкамоўны чытач мае магчымасць зразумець асноўныя вехі ўзнікнення, станаўлення і развіцця беларускага нацыянальнага руху з 1881 да 1917 г., асаблівасці яго існавання ў гады першай сусветнай вайны.

Гісторыя Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ад 1917 да 1991 г. разгледжана канадскім прафесарам Д.Марпалзам. У двух артыкулах ён адлюстроўвае падзеі рэвалюцыйнага перыяду і гісторыю Беларускай Народнай Рэс-

* Handbuch der Geschichte Weissrusslands / hrsg. von Dietrich Beyrau und Rainer Lindner. Goettingen, 2001. 543 S.

публікі, гісторыю ўтварэння БССР, беларусізацыю 1920-х гг., калектывізацыю сельскай гаспадаркі ў Савецкай Беларусі, сацыялістычную індустрыялізацыю, а таксама падзеі ў Заходняй Беларусі ў складзе БССР, гісторыю германскай агрэсіі і акупацыі Беларусі. Пасляваенная гісторыя БССР паказана навукоўцам пад вуглом асвятлення гісторыі аднаўлення і індустрыялізацыі на працягу двух пасляваенных дзесяцігоддзяў, часу кіравання П.М.Машэрава (1965—1980 гг.), Чарнобыльскай трагедыі і часу перабудовы. Д.Марплз з выкарыстаннем розных крыніц і літаратуры паказвае ролю урбанізацыі 1960—1970-х гг. як важнейшага фактару эканамічнага развіцця беларускай рэспублікі і вырашальнай асновы для пераўтварэння Мінска ў палітычны, гаспадарчы і культурны цэнтр.

Канадскі вучоны адзначае моцны ўплыў «русіфікацыі» і «саветызацыі» на беларусаў, паказвае залежнасць радыкальных змен у рэспубліцы ад знешніх, а не ўнутраных прычын. Як прыклад гэтага ён разглядае падзеі, якія ў Савецкай Беларусі мелі месца як у 1919, так і ў 1991 гг.

Два апошнія артыкулы другой часткі падрыхтавалі германскія даследчыкі В.Бенеке з універсітэта Гётынгена «Крэсы. Беларускія тэрыторыі ў Рэспубліцы Польскай (1921—1939)» і А.Зам з універсітэта Манхайма «Ад БССР да Рэспублікі Беларусь — Беларусь (1988—2001)». В.Бенеке падрабязна спыняецца на тых гістарычных момантах, якія ўжо знайшлі адлюстраванне ў яго навуковым даследаванні «Усходнія вобласці Другой Рэчы Паспалітай. Дзяржаўная ўлада і цывільны лад у рэгіёне нацыянальных меншасцей 1918—1939» (Кёльн—Веймар—Вена, 1999). У «Даведніку па гісторыі Беларусі» В.Бенеке акцэнтуе ўвагу на гістарычных праблемах новай усходняй мяжы Польшчы пасля падпісання мірнага дагавора ў Рызе ў 1921 г., на становішчы беларусаў у складзе Другой Рэчы Паспалітай, гаспадарчых асновах існавання і сутнасці зямельнай рэформы, на школьнай і моўнай палітыцы, дзяржаўным і мясцовым кіраванні, сітуацыі нестабільнасці ў Беларусі, а таксама на палітычных патрабаваннях прадстаўнікоў беларускай этнічнай меншасці. У заключэнні аўтар адзначае, што беларускае пытанне стала цэнтральным не ў апошнія гады Другой Рэчы Паспалітай, а з 1918 г. і заставалася такім не па прычыне самастойнай арганізацыі гэтай часткі насельніцтва крэсаў, а ў сувязі з геапалітычным становішчам Беларусі.

А.Зам у сваім артыкуле, прысвечаным першаму дзесяцігоддзю гісторыі Рэспублікі Беларусь, адразу акрэслівае мяжу нацыянальнага дыскурсу, які, на яе погляд, пачынаецца ў БССР у снежні 1986 г., калі 28 беларускіх грамадскіх, культурных і навуковых дзеячаў звярнуліся да Генеральнага сакратара ЦК КПСС М.Гарбачова з лістом, у якім выказалі сваю заклапочанасць небяспечным станам беларускай мовы. 1990-я гады падаюцца даследчыцай у рамках важнейшых падзей, звязаных з абвяшчэннем незалежнасці Беларусі, пошукамі агульнанацыянальнага кампрамісу ў першай палове 1990-х гг., распрацоўкай шляхоў выхаду з эканамічнага крызісу, жаданнем збліжэння з Расіяй, увядзеннем прэзідэнцкай сістэмы кіравання і яе ўмацаваннем на аснове канстытуцыйных дапаўненняў і змяненняў 1996 г., з падрыхтоўкай да новых парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў 2000 і 2001 гг. У рэзюме артыкула А.Зам адзначае, што сёння існуе своеасаблівы парадокс, сутнасць якога вынікае, з аднаго боку, з захавання беларускай дзяржаўнай самастойнасці і, з другога боку, з імкнення да палітычнай інтэграцыі з Расіяй, актыўнай распрацоўкі курса на іх далейшае аб'яднанне, пошукаў аптымальнай формы палітычнага, гаспадарчага і міжнароднага існавання саюзнай дзяржавы і г. д.

Такім чынам, у першых дзвюх частках даведніка нямецкамоўнаму чытачу прапанаваны матэрыялы пра гісторыю беларускай дзяржаўнасці і асноўныя вехі дзяржаўна-палітычнага самавызначэння беларускага народа, а таксама пра этапы навуковага вывучэння яго гістарычнага мінулага і сучаснасці.

Асаблівасці гаспадарчай, сацыяльнай, культурнай гісторыі Беларусі разгледжаны ў трэцяй, апошняй і самай вялікай, частцы даведніка (с. 199—489). Гэта частка падзелена на пяць асобных тэматычных раздзелаў.

Першы з іх «Сацыяльнае становішча і гаспадарка» — ахоплівае перыяд з часоў ВКЛ і да XX ст. Польская даследчыца Т.Зелінска і беларускія гісторыкі А.Кіштымаў, П.Лойка, А.Каханоўскі выкарыстоўваюць шматлікія гістарычныя факты для характарыстыкі беларускай эліты ў асобе баярства, князёў і магнатаў, для выяўлення месца і ролі шляхты ў Расійскай імперыі. Паказваюцца прычыны прыгону беларускага сялянства з сярэдзіны XVI ст. і захавання прыгонных адносін да першай паловы XIX ст., разглядаюцца асаблівасці сацыяльных і гаспадарчых змяненняў сялянства пасля адмены прыгону і да пачатку сацыялістычнай калектывізацыі ў 1929 г.

Спынімся толькі на артыкуле А.Кіштымава, які спрабуе праз прызму паняцця «індустрыялізацыя» правесці навуковы аналіз развіцця беларускага краю на працягу ўсяго XX ст. Аўтар выяўляе вытокі індустрыялізацыі яшчэ ў канцы XIX ст. і разглядае вытворчае, прамысловае і індустрыяльнае становішча Беларусі. Ён вылучае ў гісторыі Беларусі тры перыяды індустрыялізацыі:

1) узнікненне прамысловых адносін у беларускіх губернях Расійскай імперыі (канец XIX—пачатак XX стст.); 2) сацыялістычная індустрыялізацыя Савецкай Беларусі (20-я і 30-я гг. XX ст.); 3) мадэрнізацыя беларускай эканомікі (з другой паловы 1940-х гг. і да канца XX ст.). Заключнае дзесяцігоддзе XX ст. аўтар падае як «індустрыяльнае развіццё ў пaслясавецкі час», прыводзіць для пацвярджэння сваіх высноў 4 табліцы з асноўнымі паказчыкамі па важнейшых галінах сучаснага гаспадарчага комплексу Рэспублікі Беларусь.

Другі раздзел трэцяй часткі даведніка мае назву «Функцыі і культура горада» (с. 276—333). Вялікая ўвага ў артыкуле надаецца гісторыі беларускіх гарадоў, асабліва гарадоў з магдэбургскім правам. Разгляд іх гісторыі вядзецца з канца XIV і да канца XVIII стст. з улікам такіх момантаў, як тыпалагічнае размежаванне беларускіх гарадоў з тагачаснымі еўрапейскімі гарадамі і ўзровень наяўнасці гарадскога права і права на самакіраванне. Пра гэта распавядае польскі гісторык С.Александровіч. Швейцарскі даследчык С.Родэвальд у сваім артыкуле бярэ для гістарычнага аналізу толькі адзін старажытны Полацк і прасочвае змены ў яго развіцці ад часу ўзнікнення і да 1563 г. У рэзюме аўтар адзначае, што сярэдневяковая гісторыя горада сведчыць пра значны ўплыў «усходнесярэднееўрапейскай» традыцыі на развіццё сярэдневяковага Полацка і пра наяўнасць у ім прынцыповых адрозненняў ад гарадоў Маскоўскай дзяржавы. У выніку разбурэння горада ў 1563 г. войскамі Івана IV усе гэтыя адрозненні знікаюць, пра што сведчыць змешчаная ў даведніку панарама горада падчас уступлення С.Баторыя ў Полацк у 1579 г.

Два заключныя матэрыялы гэтага раздзела прысвечаны старому і новаму Мінску. Гісторыю развіцця горада з часоў надання яму ў 1796 г. новага статуса расійскага губернскага горада і да 3 ліпеня 1944 г. — дня вызвалення горада ад войскаў германскага вермахта — разглядае З.Шыбека. Нямецкі даследчык Т.Бон працягвае разгляд і паказвае будаўніцтва сацыялістычнага горада пасля другой сусветнай вайны. Ён прасочвае асноўныя вехі аднаўлення і развіцця горада як сталіцы Беларусі. У заключэнні свайго артыкула Т.Бон ставіць пытанне: сённяшні Мінск застанецца «постсавецкім правінцыяльным горадам» ці стане «еўрапейскай метраполіяй»?

Гісторыя этнічных змяненняў і канфесіянальнае жыццё на беларускіх землях з сярэднявечча і па найноўшы час пададзены ў пяці навуковых артыкулах, сабраных у трэцім раздзеле пад назвай «Этнічнасць і веравызнанне» (с. 334—407). Артыкулы падрыхтаваны аўтарамі з Беларусі, Германіі і Польшчы: «Культурная геаграфія і этнічныя змяненні ў беларусаў у сярэднія вякі і ў ранні новы час» (І.Чаквін, Беларусь), «Рэгіёны Беларусі ў эпоху канфесіяналізацыі» (Ю.Освальт, Германія), «Этнічныя змяненні і нацыянальная палітыка ў беларускіх правінцыях (1795—1914)» (П.Церашковіч, Беларусь), «Яўрэі Беларусі ў 17 і 18 стагоддзях» (Э.Іофе, Беларусь), «Яўрэйскі свет у Беларусі з канца 19 стагоддзя і да халакоста» (М.Іваноў, Польшча) Як згадваецца ў артыкулах І.Чаквіна, Ю.Освальта, П.Церашковіча, Беларусь гістарычна з'яўлялася рэгіёнам, які пастаянна знаходзіўся пад уплывам розных этнічных і канфесіянальных фактараў. У выніку гэтага на яе тэрыторыі мірна суіснавалі розныя этнасы і канфесіі, што тлумачылася талерантнасцю карэннага насельніцтва. У гэтай сувязі складвалася сітуацыя, якая пастаянна патрабавала вызначэння этнічнай і канфесіянальнай прыналежнасці мясцовага насельніцтва. Для пацвярджэння сваіх поглядаў аўтары прыводзяць шматлікія статыстычныя дадзеныя. З іх вынікае, што ў Беларусі неабходна было ва ўсе часы праводзіць вытрыманую этнічную ці нацыянальную палітыку, захоўваць асноўныя тэндэнцыі мірнага суіснавання беларусаў, палякаў, рускіх, украінцаў, яўрэяў, татараў, немцаў, літоўцаў, латышоў і інш.

У артыкулах Э.Іофе і М.Іванова прасочваецца лёс яўрэйскага насельніцтва ў Беларусі на працягу чатырох апошніх вякоў. Яны вызначаюць своеасаблівасць гісторыі беларускіх яўрэяў. Высновы падмацаваны гістарычнымі фактамі і статыстычнымі дадзенымі. Так, паводле вынікаў першага агульнарасійскага перапісу насельніцтва 1897 г., у беларускіх губернях пражывала каля 14% яўрэяў, пры тым, што ў Расійскай імперыі — толькі 3,4, на Украіне — 8,5 і ў Каралеўстве Польскім — 9,2%. У асобных гарадах Беларусі, напрыклад, Бабруйску, Слоніме, Пінску, Смаргоні і Слуцку, яўрэйскае насельніцтва складала ад 60 і да 77% жыхароў. У XX ст. гэтыя суадносіны радыкальна змяніліся, асабліва пасля Вялікай Айчыннай вайны. Як заключае М.Іваноў, нацысцкая палітыка генацыду ў гады вайны прывяла да страты ад 75 да 80% яўрэйскага насельніцтва Беларусі.

«Вайна і выжыванне ў 20 стагоддзі» (с. 408—436) — назва перадапошняга раздзела даведніка. Тут чытачу прапанаваны два матэрыялы. Першы з іх належыць германскаму навукоўцу Б.К'яры — аўтару вядомага нямецкамоўнага выдання «Будні па-за фронтам. Акупацыя, калабарацыя і супраціў у Беларусі (1941—1944)» (Дзюсельдорф, 1998). У сваім артыкуле даследчык разглядае праблему існавання «ваеннага грамадства» ў Беларусі ў гады другой сусветнай вайны і заключае, што на працягу гэтага перыяду ў гісторыі беларускага грамадства мелі месца падзеі, якія, на думку Б.К'яры, два разы прыводзілі да разбурэння

грамадскай супольнасці: спачатку гэта было звязана з саветызацыяй (1939—1941), а затым з германскай акупацыяй (1941—1944). У першым выпадку аўтар, аналізуючы перадваеннае беларускае грамадства, дае яму адметную характарыстыку як грамадства з «фундаментальнай небяспекай» для людзей. У другім Б.К'яры прыходзіць да высновы, што германская ваенная і грамадзянская адміністрацыі паўсюдна і часта без усялякай на тое патрэбы выкарыстоўвалі адзіны сродак — тэрор, без якога акупацыйны рэжым не мог ні кіраваць, ні панаваць у беларускім «ваенным грамадстве».

«Тэрор, дэпартацыя, генацыд: дэмаграфічныя змяненні ў Беларусі ў 20 стагоддзі» — такая назва артыкула прафесара Аполскага універсітэта М.Іванова (Польшча). Ён адразу ж зазначае, што ў беларускай гісторыі ХХ ст. мелі месца падзеі, якія радыкальна паўплывалі на змены ў складзе насельніцтва Беларусі і прывялі да «нацыянальнай катастрофы». Менавіта насельніцтва Беларусі панесла «практычна самыя вялікія страты сярод усіх еўрапейскіх краін і народаў». У пераліку прычын гэтага М.Іваноў называе розныя гістарычныя падзеі: першая сусветная вайна (1914—1918), грамадзянская вайна (1917—1920), партызанская вайна беларусаў у Заходняй Беларусі (1921—1925), калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР (1928—1934), індустрыялізацыя (1925—1940), рэпрэсіі 1930-х гг. Германска-савецкая вайна 1941—1945 гг., паводле слоў М.Іванова, стала для Беларусі нацыянальнай дэмаграфічнай катастрофай. Агульныя страты, якія панесла насельніцтва Беларусі ў гады другой сусветнай вайны, паводле меркаванняў даследчыка, складаюць 3,4 млн. чалавек (трэць усяго насельніцтва Беларусі).

Заключны раздзел трэцяй часткі — «Мова і літаратура» (с. 437—489). Яго аўтарамі з'яўляюцца даследчыкі з Аўстрыі, Вялікабрытаніі і Беларусі: «Мовы ў Беларусі да канца 19 стагоддзя» (Д.Дзінглі, Вялікабрытанія), «Барацьба вакол мовы ў 20 стагоддзі» (Г.Бідэр, Аўстрыя), «Беларусь у адлюстраванні сваёй мастацкай літаратуры» (І.Афанасьеў, Беларусь). Шырокая тэматыка і вялікі перыяд далі аўтарам магчымасць паказаць нямецкамоўнаму чытачу гісторыю беларускай мовы ад яе ўзнікнення і да сённяшняга часу, пры гэтым падрабязна спыніцца, па-першае, на вытоках беларускай мовы, паказаць яе пераўтварэнне ў мову дзяржаўнага справаводства ў Вялікім княстве Літоўскім, далейшае развіццё і катастрафічны занапад у абставінах складанай моўнай палітыкі ў Рэчы Паспалітай, паказаць адраджэнне беларускай мовы і літаратуры ў XIX ст., адметнасці суіснавання з іншымі мовамі. Па-другое, паказаць гісторыю развіцця беларускай літаратурнай мовы ў перыяд нацыянальнага адраджэння (на прыкладзе «Нашай нівы»), працэсы беларусізацыі ў БССР у 1920-я гг. і асаблівасці нацыянальнага руху ва «ўсходняй Польшчы» (Заходняй Беларусі. — **С.Н.**), моўнай сітуацыі ў 1930-я і 1960-я гг., «эфемернай беларусізацыі» ў гады першай і другой сусветных войнаў і «адраджэння» ў гады перабудовы. Па-трэцяе, разгледзець беларускую мастацкую літаратуру ХХ ст. з пункту погляду яе ўзнікнення, станаўлення і развіцця «насуперак усім аб'ектыўным фактарам». Таму зусім не выпадкова, што беларуская літаратура гэтага часу, як адзначае І.Афанасьеў, фактычна адлюстроўвала не толькі лёс беларусаў, але і была адначасова «трагічным увасабленнем нацыянальнай гісторыі».

Даведнік мае дадатак, які ўключае карты, храналагічную табліцу гістарычных падзей, спісы скарачэнняў і асноўнай бібліяграфіі, а таксама паказальнік імёнаў, рэгістр геаграфічных назваў і спіс аўтараў.

Звярнуўшы ўвагу на тэматыку, якая прадстаўлена ў гэтым выданні, можна заўважыць, што шэраг гістарычных і беларусазнаўчых пытанняў застаецца па-за межамі акрэсленай вышэй тэматыкі. Але гэта не бракуе навуковай і грамадскай значнасці даведніка. Матэрыялы, якія пакладзены аўтарамі ў яго аснову, даволі шырокія, аб'ёмныя і каштоўныя. Нямецкамоўны «Даведнік па гісторыі Беларусі» можна разглядаць у якасці трывалага падмурку для таго, каб, з аднаго боку, яскрава ўбачыць поле навуковага інтарэсу сучаснай германскай гістарыяграфіі да гісторыі Беларусі, а з другога — наглядна высвеціць перад айчыннымі даследчыкамі тыя праблемы, якія патрабуюць неадкладнага навуковага вырашэння.

У цэлым матэрыялы рэцэнзуемага даведніка пераканаўча сведчаць, што гісторыкі еўрапейскіх краін разам з беларускімі калегамі стварылі сумесную працу, якая стала даступнай замежнаму чытачу і дзякуючы мове выдання інтэгравана ў сучасную сусветную гістарыяграфію. А ў айчынную? Адказ на ўзніклае пытанне вынікае, на наш погляд, з гэтай рэцэнзіі, якой мы спрабавалі перш-наперш абудзіць у аматараў і спецыялістаў навуковы інтарэс да вышэйакрэсленай праблематыкі, а таксама дапамагчы беларускай грамадскасці хутчэй усвядоміць важнасць нямецкамоўнага «Даведніка па гісторыі Беларусі».

**Сяргей Новікаў**,
*загадчык кафедры гісторыі і беларусазнаўства Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага універсітэта, кандыдат гістарычных навук.*